предусматривает возможность принятия решения только единогласно. Учитывая растущие потребности гражданского оборота, необходимо закрепить в белорусском законодательстве возможность отступления от принципа единогласия при принятии решений о пользовании общим имуществом в простом товариществе.

*Д.А. Іваноўскі, С.В. Ставер*
БДЭУ (Мінск)

# ІДЭЯ СІНТЭЗУ КАШТОЎНАСЦЕЙ І ІДЭАЛАЎ УСХОДУ І ЗАХАДУ Ў ГІСТОРЫІ ПАЛІТЫЧНАЙ І ПРАВАВОЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ І ЯЕ ЗАМАЦАВАННЕ Ў ІДЭАЛОГІІ БЕЛАРУСКАЙ ДЖЯРЖАЎНАСЦІ

Беларусь у сілу свайго геаграфічнага становішча заўсёды знаходзілася на стыку дзвюх культур — заходняй і ўсходняй. Гэтая акалічнасць абумовіла "ваганне" беларускай культуры, якая ўвабрала ў сябе як усходнія, так і заходнія рысы, але пры гэтым так і не здабыла поўнай самабытнасці, схіляючыся то на адзін, то на другі бок. Гэтае ваганне працягваецца і дагэтуль. У працэсе гістарычнага развіцця ў Беларусі з'явіліся тры пункты гледжання на тое, як павінна аформіцца беларуская культура.

*Першая пазіцыя* — праславянская. Прадстаўнікі гэтай пазіцыі імкнуліся не толькі да кансервацыі традыцыйных рэлігійна-ідэалагічных асноў, але і да захавання і абароны спрадвечна народных, нацыянальных духоўна-культурных каштоўнасцей ад заходне-каталіцкай экспансіі. Ненавісная ім "латынь" з'яўлялася знакам рэлігійна-культурнай агрэсіі каталіцкага Захаду. Аднак у сваім імкненні да захавання традыцыйнай нацыянальнай культуры, праваслаўнай веры кансерватыўна настроеныя дзеячы спрабавалі адгарадзіцца ад жыватворнага культурнага ўплыву Захаду, у сувязі з чым іх спроба абараніцца ад надыходзячага каталіцызму абярнулася адхіленнем еўрапейскай свецкай культуры, рэнесансна-гуманістычнай адукаванасці. З пункту гледжання культуралагічнай пазіцыі Арцемія, Вішэнскага, Авакума і ім падобных гэта можа тлумачыцца як абсалютызацыя праваслаўна-рэлігійных і нацыянальна-культурных каштоўнасцей у шкоду каштоўнасцям агульначалавечым.

*Другая*, празаходняя, *пазіцыя* дыяметральна процілеглая першай, паколькі яна нацэльвала на аднабаковую арыентацыю на заходнія духоўна-культурныя каштоўнасці і ў канчатковым рахунку ўтойвала ў сабе магчымасць нацыянальна-культурнага паглынання, дэнацыяналізацыі. Яе выразнікамі з'яўляліся прадстаўнікі паланізаванай шляхты і гараджан, ідэолагі і актыўныя правадыры Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. Якімі б добрымі дэкларацыямі ні абаранялі ўнію яе творцы і прыхільнікі, у рэчаіснасці яна ў вялікай ступені з'явілася гвалтам над

рэлігійнай воляй пераважнай часткі беларусаў, замахам на нацыянальна-культурную і грамадзянска-палітычную волю народа, паколькі ўводзілася прымусова.

*Трэцяя пазіцыя* была прадстаўлена ідэолагамі айчыннага рэнесанснa-гуманістычнага руху. Асуджаючы канфрантацыю, яны меркавалі, што Усход і Захад павінны весці паміж сабою вольны і канструктыўны дыялог, заснаваны на добраахвотнасці, узаемнай памяркоўнасці і выбіральнасці, сінтэзе ўсходніх і заходніх духоўна-культурных каштоўнасцей. Асуджаючы ўсялякае, як рэлігійнае, так і свецка-культурнае гвалтаванне, айчынныя мысліцелі-гуманісты не згаджаліся таксама і з палітыкай духоўна-культурнай ізаляцыі, нацыянальна-рэлігійнай замкнёнасці. Для мысліцеляў Беларусі і Украіны дадзенай арыентацыі (Ф. Скарына, М. Ліцвін, С. Будны, В. Цяпінскі, А. Волан, Л. Сапега, Л. Зізаній, П. Магіла, З. Косаў, С. Полацкі і інш.) характэрна канструктыўнае дачыненне як да заходняга, так і да ўсходняга, у прыватнасці грэка-візантыйскага і ўсходнеславянскага, культурна-філасофскага погляду. Гэты кірунак унёс істотны ўклад як у працэс сінтэзу духоўна-культурных каштоўнасцей Усходу і Захаду на айчыннай глебе, так і ў справу абароны, якая фарміруецца ў беларускай дзяржаўнасці, культуры, роднай мове, станаўленні нацыянальна-патрыятычнай свядомасці.

Такім чынам, можна ўбачыць існаванне трох культурных плыняў, якія і складаюць аснову нацыянальна-вызваленчай ідэі пабудавання істотна новага грамадскага і дзяржаўнага ладу.

***Н.С. Калиновская, О.Н. Кучинская***
БГЭУ (Минск)

## РАЗВИТИЕ ПРАВА В УСЛОВИЯХ ГЛОБАЛИЗАЦИИ

Одной из явных и неоспоримых тенденций развития современного мира является глобализация.

Глобализация правового пространства способствует созданию единого правового поля, нивелируя особенности национальных законодательств. Глобализации уделяют значительное внимание экономисты, политологи, социологи, философы, такие как П.С. Безруких, О.Б. Буздалина, Л. Горбатова, П.Д. Баренбойм и др. Они констатируют серьезные изменения, происходящие в обществе и государстве в результате глобализации. К сожалению, юристы не проявили должного интереса к изучению влияния глобализации на государство и право. Это не может не вызывать озабоченности, поскольку такое влияние возрастает, сказывается на характере и функциях государства и права.

В современных условиях перед правом встает проблема управления глобализацией, гармонизации ее процессов. Право выступает в качест-



БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by